# ЛЕНІНСКАМУ ЮБІЛЕЮ—ВЫДАТНУЮ ВУЧОБУ!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Выдаецца з 1 мая 1935 г.

1980 г.
17
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 2 (1266)

Выходзіць раз у тыдзень.

Цана 2 кап.

## Пяцёрка ў залікоўцы

КОЛЬКІ памятае сябе студэнцтва—столькі і існуюць гэтыя выпрабаванні—экзамены. Хоць і шмат часу мінула з тае пары, але амаль нічога новага ў самім працэсе не змянілася. Традыцыйная форма жывучая: пытанне — адказ, пытанне — адказ. (Бывае і так: пытанне — маўчанне, пытанне — пытанне). Праўда, НТР унесла пэўныя карэктывы ў шаблонныя адносіны студэнта і прафесара ў час сесіі. (Не памятаю ніводнаї мініяцюры, гумарэскі са студэнцкага жыцця, дзе б абышліся без іх). Дзенідзе паявіліся складаныя камп'ютэры, якія, на думку іх вынаходнікаў, у стане замяніць хоць дзесятак прафесараў. Заўважана, што студэнты ахвотней здаюць экзамены гэтым машынам, чым выкладчыку. Маўляў, гэтай скрынцы, начыненай дыёдамі, рэзістарамі і іншымі хітрымі штукамі, лягчэй здаць. Урэшце з ёю можа здарыцца кароткае замыканне, што выключна рэдка бывае з паважаным прафесарска-выкладчыцкім кантынгентам.

Але на экзамене па фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, які здаваў III курс геаграфічна-

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**



## АДКАЗНАСЦЬ КОЖНАГА

МНОГА карысных спраў на рахунку народных кантралёраў факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, дзе групу ўзначальвае вось ужо некалькі год прафесар Аркадзь Іосіфавіч Наркевіч. У групу ўваходзяць студэнты, выкладчыкі, лабаранты.

Размеркаванне дзейнасці народных кантралёраў па сектарах дазваляе больш дэталёва выконваць асобныя мерапрыемствы і наогул свае абавязкі. Такіх сектараў у нашай групе чатыры — арганізацыйны, вучэбны, бытавы і навуковы. Кожны, хто выконвае пачэсны абавязак народнага кантралёра, ведае, што ён заклікаsuccessfully працаваць сярод людзей, павінен дапамагаць калектыву ў выкананні пастаўленых задач. Вось, напрыклад, у плане дзейнасці вучэбнага сектара, у які ўваходзяць выкладчык А. К. Свораб, студэнтка II курса А. Сухоцкая, лабарант кафедры радыё і тэлебачання Л. Е. Марцыёнка, — рознабаковыя мерапрыемствы, звязаныя з паляпшэннем вучэбнага працэсу. Гэта праверка заняткаў, кантроль за арганізацыяй і правядзеннем экзаменацыйных сесій і г. д.

Група сістэматычна правярае работу студэнцкай сталовай, клапоціцца аб быце студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце. Галоўнае ў рабоце народных кантралёраў—дзейснасць, эфектыўнасць праверак і прымаемых рашэнняў. Мы, напрыклад, змаглі ліквідаваць некаторыя зрывы ў рабоце сталовай.

Абавязковая ўмова дзейнасці нашай групы — публічнасць. Вынікі праверак і прынятыя па іх меры заўсёды можна ўбачыць у «Камсамольскім пражэктары», насценнай газеце «Журналіст». Дошка народнага кантролю паведамляе аб мерапрыемствах групы НК. Усе практычныя пытанні кантралёры рашаюць у цеснай сувязі з партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацыямі факультэта.

**С. БАГДАНОВІЧ,**
**член групы НК факультэта журналістыкі.**

## ТВОРЧЫ ПАДЫХОД

З ЧАГО ЗВЫЧАЙНА пачынаецца падрыхтоўка студэнта да семінарскіх заняткаў, сесіі? З добрага кабінета. Ён ветліва сустракае маладых людзей, дорыць ім добры настрой. Іменна тут можна атрымаць неабходную інфармацыю, бібліяграфічныя даведкі, вучэбную і метадычную літаратуру.

Кабінет кафедры навуковага камунізму, на першы погляд, нічым не адрозніваецца ад іншых.Чаму ж, калі я ўпершыню адкрыла дзверы гэтага кабінета, адчула адразу цеплыню і ўтульнасць?

Хударлявы хлапец у вялікіх акулярах (не інакш фізік ці матэматык) падышоў да вялікага стала з акуратна раскладзенымі на ім падшыўкамі газет і прыняўся лістаць «Праўду».

Інтуіцыя не падвяла мяне. Сяргей Шых вучыцца на пятым курсе фізічнага факультэта і думае сваё жыццё прысвяціць вывучэнню фізікі цвёрдага цела. Цікавасць да актуальных пытанняў ідэалагічнай барацьбы прывяла яго ў гэты кабінет. Акрамя таго, сёння вечарам залік па навуковаму камунізму. А дзе яшчэ, па меркаванню Сяргея, можна так добра падрыхтавацца?

...Цяжка самому студэнту выбраць кнігу. Бо ў кабінеце шмат твораў заснавальнікаў навуковага камунізму, зборнікаў партыйных дакументаў. А колькі тут вучэбна-метадычнай літаратуры: хрэстаматый, слоўнікаў, манаграфій, часопісаў!

Як падабраць неабходную літаратуру? Тут вы не ўбачыце чаргі ці блукаючых сярод кніжных стэлажоў студэнтаў. Яны звяртаюцца да лабарантаў, і тыя, у сваю чаргу, пры дапамозе каталога дапамагаюць ім у выбары літаратуры. Для гэтага патрабуецца не больш пяці мінут. Калі ўзнікае якое-небудзь пытанне, яго можна задаць выкладчыкам кафедры навуковага камунізму (адпаведна з графікам кансультацый яны кожны дзень дзяжураць у кабінеце). Бывае, што студэнт не можа вызначыць тэму рэферата ці даклада да семінарскіх заняткаў. З ім заўсёды пагавораць загадчык кафедры прафесар П. П. Дронь, выкладчык ці загадчык кабінета. Улічваючы індывідуальныя здольнасці студэнта, яны абавязкова падкажуць яму падыходзячую тэму.

...З усмешкай сустракае лабарант Ала Уладзіміраўна Цітова невысокую дзяўчыну з каратка падстрыжанымі каштанавымі валасамі. Увагу ўвайшоўшай прыцягнула новая выстаўка «У. І. Ленін—вялікі стваральнік навуковага камунізму». Валя Несцер займаецца на пятым курсе біяфака, часта наведвае кабінет навуковага камунізму. Сёння студэнтка будзе працаваць над дакладам «Выхаванне моладзі на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях».

Супрацоўнікі кабінета, а іх трое, строга размеркавалі паміж сабой абавязкі. Напрыклад, работа загадчыцы Маі Паўлаўны Буглак носіць метадычны характар: яна адказвае за арганізацыю работы кабінета, удзельнічае ў падрыхтоўцы наглядных дапаможнікаў і афармленні картатэкі. Лабаранты А. У. Цітова і Н. А. Матусевіч выдаюць літаратуру, афармляюць каталогі, даюць бібліяграфічныя даведкі. Такі парадак ў немалой ступені садзейнічае павышэнню эфектыўнасці працы, і траціцца на напісанне работы менш часу, якога ў студэнта ўвесь час не хапае. Ну а ў выпадку неабходнасці кожны член маленькага, дружнага калектыву гатовы замяніць таварыша.

Для работы ў кабінеце студэнты выбіраюць выгадны ім час. Мая Паўлаўна неяк прапанавала высветліць, у якія дні і гадзіны больш за ўсё звяртаюцца да іх за дамамогай. Выдзеліць які-небудзь дзень было цяжка: работы хапала і ў панядзелак, і ў сераду, і ў суботу. А што датычыць экзаменацыйных сесій і падрыхтоўкі да дзяржаўных экзаменаў, то немагчыма назваць нават менш загружаныя гадзіны. Ім ніхто не прапаноўваў арганізоўваць дадатковыя заняткі і кансультацыі для выпускнікоў, працаваць дзве змены запар. Проста яны не змаглі паступіць інакш, таму што бачылі ў гэтым свой доўг. Доўг перад студэнтамі.

Нельга не пералічыць усё добрае, што робіцца з дня ў дзень дружным калектывам. Не так даўно загадчыца прапанавала скласці картатэку па новаму ўзору. І зараз, побач з алфавітным, у кабінеце ёсць тэматычны каталог, каталог журнальных артыкулаў па праблемах навуковага камунізму. Хутка студэнты змогуць карыстацца каталогамі, прысвечанымі 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, XXV з'езду партыі, новай Канстытуцыі СССР.

Карысць адчуваецца. Але загадчыца ўпэўнена: працаваць можна яшчэ лепш. Супрацоўнікаў кабінета хвалюе пытанне, як дапамагчы студэнтам, якія займаюцца ў другую змену. Бо раніцай у кабінеце звычайна праходзяць заняткі. З-за гэтага таксама немагчыма абсталяваць кабінет тэхнічнымі сродкамі навучання.

Хвалюе супрацоўнікаў і малая плошча кабінета. Мэтазгодней было б, па іх меркаванню, адвесці для захоўвання літаратуры спецыяльны пакой. Гэта дало б магчымасць павялічыць у некалькі разоў кніжны фонд, а таксама колькасць пасадачных месц. Дарэчы, усе студэнты, з якімі мне давялося гутарыць у кабінеце, выказалі гэту ж думку.

Рэдка студэнт выходзіць адсюль разачараваным. Але калі якая-небудзь літаратура адсутнічае, то маладыя людзі атрымліваюць спіс прапаноўваемых кніг і парады, дзе гэтыя кнігі можна атрымаць.

Няхітры метад. Але ўявіце, колькі часу эканоміць студэнт. Праўда, Сяргей Шых лічыць, што літаратуру, якой няма ў кабінеце, студэнты маглі б заказаць. Думаю, што да гэтай прапановы трэба прыслухацца.

Спачатку ў кабінеце навуковага камунізму мяне ўразіла панаваўшая там атмасфера ўтульнасці і цеплыні. Папрацаваўшы ў кабінеце некалькі дзён, пагаварыўшы са студэнтамі, я зразумела, што галоўны скарб яго — чулыя людзі — М. П. Буглак, А. У. Цітова, Н. А. Матусевіч, для якіх характэрны творчы падыход да справы. У жаданні культурна абслужыць студэнта, прадаставіць яму неабходныя ўмовы для работы хаваецца сакрэт поспеху гэтага калектыву.

**А. МАЗАЛЕВА,**
**студэнтка I курса факультэта журналістыкі.**

# ПАСЯСЛОЎЕ ДА КОНКУРСУ

У КАНЦЫ МІНУЛАГА ГОДА камісія парткома па нагляднай агітацыі і насценным друку праводзіла агляд-конкурс нагляднай агітацыі факультэтаў. Першы такі агляд дасягненняў факультэтаў у галіне нагляднай агітацыі (снежань 1978 г.) у дастатковай ступені выявіў сілы па гэтаму напрамку сацыялістычнага спаборніцтва паміж факультэтамі і прапанаваў шэраг рэкамендацый асобным факультэтам для паляпшэння стану іх нагляднай агітацыі. У лістападзе мінулага года камісіяй быў праведзены семінар-нарада намеснікаў сакратароў партыйных бюро, адказных за нагляднаю агітацыю на факультэтах, рэдактараў насценных газет, прадстаўнікоў камсамольскага і прафсаюзнага актыву для абмеркавання пытанняў аб стане нагляднай агітацыі і насценнага друку факультэтаў і абмену вопытам іх работы. Нарада праходзіла на высокім ідэйным узроўні, абмяркоўваліся пытанні аб тым, як павінен быць афармлены факультэт, каб наглядная агітацыя адпавядала патрабаванням часу.

Як жа зараз абстаяць справы з нагляднай агітацыяй ва універсітэце? Ці ўлічаны ўсе тыя заўвагі, пажаданні камісій, якія былі зроблены год назад і на лістападаўскай нарадзе?

На гэтыя пытанні і адказаў агляд-конкурс. Заслужаную перамогу атрымаў факультэт журналістыкі. У мінулым годзе журналісты раздзялілі 6—7-я месцы з геаграфічным факультэтам. Значыць, крытыка была прызнана правільнай. Факультэт стаў шырэй выкарыстоўваць свае магчымасці для стварэння сапраўды ўзорнай нагляднай агітацыі, своечасовага яе абнаўлення. Выключна таленавіта зроблены стэнды «Нашы выпускнікі» і «Салдаты Вялікай Айчыннай». На высокім ідэйным узроўні выкананы стэнды «Тэлетайп журфака», «Навучальны працэс», «Гісторыя камсамола» і іншыя.

Стэнд «Друк Беларусі ў Вялікую Айчынную»—гэта пакуль што адзіны стэнд ва універсітэце, прысвечаны 35-й гадавіне Перамогі. Разгорнута шырокая работа па афармленню таксама пакуль адзінай ва універсітэце аўдыторыі па грамадска-палітычнай практыцы студэнтаў.

Па меркаванню камісіі многія матэрыялы стэндаў і фотавыставак студэнтаў заслугоўваюць экспазіцыі ў галоўным корпусе універсітэта, каб быць набыткам шырокай грамадскасці.

Усю гэтую карпатлівую работу ўзначаліла сакратар партбюро факультэта А. А. Рудэнка з намеснікам дэкана І. І. Сачанкам. Сярод студэнтаў асабліва трэба адзначыць У. Дзюбу, А. Ціхановіч, Н. Шчалканогаву, Н. Лукашэвіч, А. Стадуба.

Другое месца, як і ў мінулым годзе, заняў біялагічны факультэт. Ім не хапіла ўсяго аднаго бала, каб параўнацца з журналістамі.

Тут наглядная агітацыя вызначаецца сваей мэтанакіраванасцю, надзённнасцю, высокім ідэйна-мастацкім узроўнем, выразнасцю, дакументальнасцю, аператыўнасцю. Прыцягваюць увагу кампазіцыі «Старонкі гісторыі», «Біяфак сёння», «Вынікі сацыялістычнага спаборніцтва» і многія іншыя. Падрыхтаваны стэнды, прысвечаныя 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Толькі на біялагічным факультэце ёсць стэнд «Сёння ў свеце», які кожны дзень з дапамогай цэнтральных і мясцовых органаў друку нясе самую актуальную і новую інфармацыю аб жыцці нашай краіны і паведамленні з-за мяжы.

Заслужаны поспех біёлагаў — вынік калектыўнай працы, якую ўзначаліў сакратар партыйнага бюро факультэта дацэнт А. І. Сцефановіч.

Зноў, як і ў мінулым годзе, пацвердзіў дастаткова высокі ўзровень сваей нагляднай агітацыі факультэт радыёфізікі і электронікі, заняўшы трэцяе месца. Тут абноўлена большая частка стэндаў, паявілася новая Дошка гонару выдатнікаў, стэнд грамадскіх арганізацый факультэта, з густам афармлены многія стэнды факультэцкіх кафедр.

Факультэты, якія занялі тры першыя месцы, вызначаюць, па меркаванню камісіі, той узровень многапланавай і аператыўнай нагляднай агітацыі, да якога неабходна імкнуцца іншым. Іх прыклад паказвае, якіх станоўчых вынікаў можна дасягнуць, калі пытанні нагляднай агітацыі не выпускаць з поля зроку партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных арганізацый.

Наступную групу (4—6-е месцы) складаюць факультэты, наглядная агітацыя якіх не абнаўлялася. Чацвёртае месца — за філфакам. Неаднаразова адзначалася, што наглядная агітацыя на філфаку цікавая, робіцца па адзінаму плану. Выдатна выканана і доўга не страціць свайго прызначэння выстаўка «Шлях, роўны стагоддзям», прысвечаная 60-годдзю БССР і КПБ, якая займае цэнтральнае месца ў нагляднай агітацыі факультэта. Але наглядная агітацыя філфака жадае быць лепшай. Устарэла на факультэце экспазіцыя, размешчаная на другім паверсе. Наступіў час замены Дошкі гонару выдатнікаў, адсутнічае наглядная агітацыя на 4-м паверсе. Не лепшае становішча на фізічным факультэце — пятае месца. (Год назад — першыя). Унікальныя па майстэрству выканання стэнды кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі ўжо маральна ўстарэлі. Фізічны факультэт не зрабіў ніводнага кроку наперад у параўнанні з факультэтамі, якія занялі першыя месцы. І вельмі крыўдна, таму што факультэт мае, бадай, самую лепшую матэрыяльную базу.

На хімічным факультэце пасля мінулага агляду-конкурсу зроблена вельмі мала. Большасць нагляднай агітацыі мае «гістарычнае» прызначэнне, бо рыхтавалася даўно і не абнаўлялася. Сакратар партыйнага бюро хімфака Л. М. Аўсянка ў ліпені сцвярджаў, што да канца года будуць падрыхтаваны новыя стэнды і наглядная агітацыя абновіцца. Але, на жаль, усё гэта засталося толькі на словах.

Юрыдычны факультэт зусім не ўдзельнічаў у конкурсе, таму што факультэт размясціўся ў новым будынку і наглядная агітацыя толькі рыхтуецца.

Гістарычны факультэт апынуўся на сёмым месцы таму, што наглядная агітацыя поўнасцю абнаўляецца. Думаецца, што абнаўленне нагляднай агітацыі — гэта паступовы і пастаянны працэс. Але ж нельга, сапраўды, зусім пазбавіць факультэт нагляднай агітацыі на цэлы семестр.

На геаграфічным факультэце (восьмае месца) рамонт ужо даўно завершаны, але работа па афармленню факультэта зусім не разгорнута. (За выключэннем кафедры глебазнаўства). Ветражы заклеены, многія зусім не маюць шкла. Пытаннямі нагляднай агітацыі не займаюцца ні дэканат, ні партыйнае бюро на чале з яго сакратаром М. К. Чартко. Яшчэ горшае становішча на факультэце прыкладной матэматыкі (9-е месца) і механіка - матэматычным (10-е месца). Тое, што тут ёсць (а ёсць тут вельмі мала) практычна не мае ніякай актуальнай накіраванасці. Кіруючым органам гэтых факультэтаў патрэбна сур'ёзна задумацца над здарыўшымся.

Чарговы агляд-конкурс закончыўся, але камісія зноў, другі год запар, павінна канстатаваць, што праблемы, звязаныя з афармленнем большасці факультэтаў сродкамі нагляднай агітацыі, застаюцца. Між іншым, прыклад вядучых паказвае, што пры сур'ёзным падыходзе да справы кіраўніцтва факультэтаў, грамадскіх арганізацый, асабліва камітэтаў камсамола, гэтыя праблемы могуць быць паспяхова вырашаны.

Ідучы насустрач 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, наш універсітэт павінен яшчэ шырэй выкарыстоўваць свае невычэрпныя магчымасці ў прапагандзе сродкамі нагляднай агітацыі ленінскіх запаветаў, дасягненняў універсітэцкім калектывам поспехаў у вучобе, навуцы, выхаванні кадраў для народнай гаспадаркі.

**Н. АНТРОПАЎ,**
**асістэнт,**
**В. ШАЛАТОНІН,**
**дацэнт, намеснік старшыні камісіі па нагляднай агітацыі і насценнаму друку.**

# Пяцёрка ў залікоўцы



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

га факультэта, камп'ютэры былі б лішнія. Каб прымалі машыны — не было б гэтага матэрыялу. Упэўніўся, дацэнтаў кафедры фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў Рылюка Георгія Якаўлевіча і Лаўрыновіч Марыю Віктараўну не замяніць і сто электронных экзаменатараў.

...Сапраўды цікава. Хто ж першы ступіў на Антарктыду? На гэта пытанне (дадатковае, зазначу; машына такіх не задае) з упэўненасцю адказаў Саша Веялкін. Вядома, Борх Грэвінг. І яшчэ былі пытанні. Шмат. І цікавыя такія, што забыўся на прамое заданне рэдакцыі (таму і здымкаў небагата). Адказы Аляксандра былі поўныя, змястоўныя. Як вынік — пяцёрка ў залікоўцы (цікава, як бы машына ставіла адзнаку — пячаткай, кампосцерам?). Рыхтуюцца да адказу Юрый Петухоў і Лена Місевіч. Хлопец (па выгляду) усё ведаў да экзамена. Прачытаўшы пытанні білета, упэўніўся, што не памыліўся. Таму і адчувае сябе так свабодна, нават спрабуе падказваць. Хаця складаная рэч. Паспрабуй падкажы, чаму раз у 100 гадоў у пустыні Сахары выпадае... снег?

Не ўсё пакуль што гладка з адказамі ў Карсаковай Вольгі. Мабыць білет выцягнула значна цяжэйшы, чым Петухоў. А спісаць тут немагчыма, дакладней, бессэнсоўна. Уяўляю, якая патрэбна шпаргалка, каб на ёй занатаваць характар глеб Паўднёвай Амерыкі ці Афрыкі. Гэта задача, мабыць, і рэдакцыйнаму Шуру Шпору не па зубах. А Афрыка... Краіна цудаў і рамантыкі! Але і клімат жа там, а звяр'я ўсялякага... Увогуле не хадзіце дзеці туды гуляць... Як казку (з пункту гледжання дылетанта) расказвае, адказваючы на свой білет, Ефрамкава Галя.

— Пад спевы якой птушкі прачынаецца і засынае абарыген Аўстраліі?

— Ёсць такая птушка кукабара. Раніцой смяецца, вечарам плача. (Гэта ж трэба...).

Пытанні сыпаліся адно за адным. Лаканічнымі і традыцыйнымі былі адказы студэнтаў.

— Ліpахвост не мае ўласнага спеву, усё жыццё пераймае галасы іншых птушак.

— Якое мора не мае...

— ...берагоў?

— Але...

— Саргасава.

— Чаму раз у 20 гадоў у пустыні Атакама ідзе дождж?

Ціхенька закрыўшы дзверы аўдыторыі, я пачуў, як упэўнены голас студэнта сцвярджаў: маўляў, такая з'ява прыроды адбываецца не без уздзеяння цячэння Эль-Ніны і другога цячэння, перуанскага, якія...

Дзверы зачыніліся. У калідоры сядзелі студэнты, у апошні раз гартаючы канспекты і падручнікі. Ім яшчэ прадстаяла ўзяць шчаслівы білет. Экзамен працягваўся.

**М. ДУБОВІК.**

## КАЛЕКТЫЎ: ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ

МНЕ АДРАЗУ спадабалася ў іх, на біяфаку. У камітэце камсамола я сустрэлася з Наташай Няхайчык. Усяго дзве мінуты мы знаёмы, а яна так па-сяброўску размаўляе са мной, так падрабязна тлумачыць, дзе і як знайсці чацвёртую групу, так цудоўна ўсміхаецца, што некалькі імгненняў я стаю, разгубленая ад нечаканасці. А Наташа расказвае мне аб факультэце, цярпліва чакае, пакуль я збяруся з думкамі. І наогул вядзе сябе так, быццам, апрача мяне, другіх спраў у яе няма на ўвесь наступны тыдзень. (Гэта толькі потым, праз некалькі дзён я даведалася, што Наташа — сакратар камітэта камсамола біяфака, і ўбачыла яе партрэт на стэндзе «Лепшыя студэнты універсітэта»).

Навошта я так падрабязна аб гэтым? Сама не ведаю. Можа проста пашчасціла, што сустракаліся мне на біяфаку такія надзвычай добрыя і спагадлівыя людзі. А можа і не памыляюцца тыя, якія кажуць, што нічога «проста так» не бывае...

А прыйшла я на біяфак, каб пазнаёміцца з чацвёртай групай чацвёртага курса. Размаўляць давялося з чатырма дзяўчатамі — Ірай, Галяй, Наташай, Тамарай (пасля растлумачу, чаму я не называю іх прозвішчаў). Разумею, што гэта недастаткова. За дзве сустрэчы нельга пазнаць ні чалавека, ні, тым болей, калектыў. Але паспрабаваць можна. Адным словам, мяркуйце самі.

— На практыцы пасля другога курса сабраліся мы аднойчы паслухаць начных птушак. Гадзіны ў дзве падняліся, пайшлі на гароды. Хадзілі-хадзілі — ніводнай птушкі не чуваць. Толькі потым здагадаліся, што такім натоўпам хадзіць нельга — мы ж іх усіх перапалохалі. Дарма толькі паўночы блукалі. —Дзяўчаты смяюцца, прыгадаўшы той выпадак.

— А памятаеце, як мы з Томкай праводзілі дослед с жабамі? З раніцы, з шасці гадзін, да ночы, аж пакуль цёмна не стала, сядзелі на балоце. Быццам знарок, увесь той дзень ліў дождж, а патрэбна было праз кожныя дзве гадзіны лавіць жаб і мераць тэмпературу іх цела. Пакуль бегаеш за імі з сачком, клянеш усё на свеце. Самі мокрыя, у будане холадна, хлеб даўно паелі—ну, быў дзянёк...

І зноў яны ўсміхаюцца. Цяпер усё здаецца смешным — і як поўзалі дзень на каленях па траве (трэба было апісаць кожную травінку на квадратным метры), і як бегалі пад халодным дажджом за такімі нечакана прыткімі жабамі... А па вечарах, калі ўжо былі зроблены ўсе справы, яны збіраліся ля кастра і спявалі песні.

БУМЕРАНГ

# НЕ ТАЯ ГУЛЬНЯ

**У СНЕЖНІ 1979 ГОДА** на старонках нашай газеты быў змешчаны матэрыял спецыяльнага карэспандэнта С. Лыскаўца «Звычайная субота», у якім былі адзначаны некаторыя недахопы ў рабоце студсавета інтэрната № 2. Падвяргалася крытыцы і адміністрацыя інтэрната.

Камендант П. А. Дудка даслаў у рэдакцыю адказ, у якім канкрэтна расказаў аб прынятых мерах. Цяпер пасажырскія ліфты працуюць строга па распарадку. Гэта пісьмо было надрукавана ў № 1 (1265) газеты «Беларускі універсітэт» за 10 студзеня 1980 года. Разам з тым, рэдакцыя напомніла, што студсавету інтэрната № 2 пара спыніць гульню ў маўчанне.

І вось, нарэшце, рэдакцыя атрымала доўгачаканае пасланне студсавета, якое падпісаў намеснік старшыні студсавета М. Касяк. Прачытаўшы гэтае пісьмо, нельга сказаць, што студсавет асэнсаваў сваю пазіцыю і зрабіў правільныя вывады. «Гульню ў маўчанне» яны трансфармавалі ў гульню са словамі на паперы. Рэагаванне студсавета насычана шматслоўнымі «роздумамі» аб культурна-масавай рабоце ўвогуле, аб цяжкасцях арганізацыі адпачынку студэнтаў. Але дзе ж канкрэтныя справы? Што зрабілі вы, паважаныя члены студсавета, каб належным чынам арганізаваць культурна-масавую работу ў інтэрнаце? Якія ў вас планы? Як яны выконваюцца? Пытанняў шмат. Ні на адно студсавет адказу пакуль не даў.

З нашай пошты

## У ПАХОДЗЕ

Я ЗАХАПЛЯЮСЯ турызмам. Захапляюся даўно, з таго часу, калі ўпершыню адчула ўсю прыгажосць, зачараванасць прыроды. Самае галоўнае, што ў кожным паходзе я знаходжу для сябе нешта новае, знаходжу тое, што, на мой погляд, так неабходна ўсім нам. Вось звычайны чалавек. Здаецца, пра яго мы ведаем усё. Але так толькі здаецца. Іменна ў паходзе, сутыкнуўшыся з сапраўднымі цяжкасцямі, раскрываецца яго характар.

Зусім нядаўна я вярнулася з паходу па мясцінах баявой і рэвалюцыйнай славы Беларусі. За тыдзень наша група з дзевяці чалавек прайшла звыш ста васьмідзесяці кіламетраў. Наш шлях праходзіў па балоцістых, вельмі небяспечных для турыстаў участках Мінскай вобласці. Таму мы ішлі строга па азімуту, каб не збіцца і не заблудзіць. Але, нягледзячы на гэта, паход вельмі спадабаўся. Асабліва ўразіў першы снег, які выпаў нечакана, знянацку. Колькі было радасці, шчырых, вясёлых усмешак на тварах маіх сяброў: камандзіра атрада Алены Меркуловіч, Дзмітрыя Ушынскага, Наталлі Іулевай і іншых.

Каўказ, Карпаты, Налібоцкая пушча, Блакітныя азёры, Крымскія горы — вось той далёка не поўны спіс мясцін, дзе я ўжо пабывала, дзе правяла шмат прыемных хвілін з рукзаком за плячыма.

Хутка канчаецца сесія. Пачнуцца канікулы. І я зноў мару паплысці ў свой чарговы паход.

**І. ТАРАСЕВІЧ,**
**студэнтка III курса хімічнага факультэта.**

# ЧАС НЕ ЧАКАЕ

У СВЕТЛЫХ калідорах журфака ні на мінуту не змаўкае гаворка. Гучыць званок, але студэнты нікуды не спяшаюцца. Ідзе сесія.

То тут, то там чуецца ліхаманкавы шоргат старонак падручніка (нехта верыць, што яшчэ не ўсё згублена); у другім месцы хтосьці дае кансультацыю, і ўсе стоўпіліся вакол «інтэлектуала»; а то раптам на адным выдыху гучыць пытанне: «Ну, што? Выдатна?» Ідзе сесія.

А недзе за дзвярыма аўдыторыі схілілі галовы таварышы над білетамі. Ім патрэбна ў каторы ўжо раз даказаць сваё права вучыцца ва універсітэце, пацвердзіць прыкладам, што прызванне знойдзена, прафесія выбрана правільна. І многім у гэты час дапамагае думка аб сваім шляху ва універсітэт, думка аб тых хвалюючых мінутах уступных экзаменаў, аб чаканні вынікаў, аб радасці блізкіх і сяброў за цябе. І гэта, здаецца, надае табе больш сілы, большую ўпэўненасць твайму адказу, і ты прымушаеш экзаменатара ставіць у «залікоўку» чарговае «выдатна».

І выходзяць з радаснымі тварамі, з песнямі на душы студэнты нашай першай групы II курса факультэта журналістыкі Саша Лазоўскі і Таня Ермалаева, Коля Лахвіч і Ірына Зяньковіч. Здаецца, колькі хвілін таго экзамена, але за ім стаяць карпатлівая падрыхтоўка, работа на лекцыях і семінарскіх занятках, гадзіны, праведзеныя ў чытальных залах, заданні рэдакцый, выкананне якіх давала добрую жыццёвую падрыхтоўку. Рыхтуючыся да экзамена па беларускай літаратуры, Саша Васількевіч, напрыклад, прачытаў шмат твораў звыш праграмы, а А. Дашчынскі выдатна аформіў літаратурны дзённік. І як вынік — добрыя адзнакі ў залікоўках.

Здадзены чарговы экзамен, з палёгкай уздыхаюць студэнты: цяпер можна і адпачыць. І вечарам у інтэрнаце загучыць музыка (праўда, каб не перашкаджаць іншым), і сядуцца ў пакой аднакурснікі, і пачуюцца вясёлы смех, жарты...

А назаўтра — зноў за кнігу, за канспект, зноў гадзіны напружанай працы, падрыхтоўка да наступнага экзамена. Час не чакае!

**А. КОЗЕЛ,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**

## ● ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ ●

Нячутна кранае студзень сваімі марознымі сярэбранымі крыламі галінкі бяроз. І тады, нібы ў самай цудоўнай казцы,ператвараюцца яны ў беластвольных прыгажунь-дзяўчат. Стаяць нерухома, баючыся нават уздыхнуць. І толькі лёгкі ветрык-хітрун, нечакана прыляцеўшы аднекуль, лагодна перашэптваецца з імі. А ў празрыстай вышыні, за блакітным морам паветра ўсміхаецца чырванашчокае ад марозу сонейка. Усміхаецца шчыра і весела.

У гарадскім парку цішыня. Нязграбныя лаўкі-дзівачкі і велічныя елкі-красуні прысыпаны снегам. Ён іскрыцца, пераліваючыся ў сонечных праменнях рознакаляровымі крышталікамі. Толькі рэдкі прахожы пройдзе па доўгай, бясконцай сцежцы, аглушаючы наваколле няўмольным рыпам сваіх ботаў.

— Дзень добры! — казачны лес.
— Дзень добры! — чараўніца-зіма.

Фота **С. Стаса.**





# ВУГАЛ УЗЫХОДЖАННЯ

Была і песня аб практыцы, якая засталася «ў спадчыну» невядома з якога часу:

«Две сотни видов умри,
но дай,
И днем и ночью сачком
махай,
Рви травку с корнем, теряя
счет,
Зубри латынь, чтобы сдать
зачет».

На практыцы ім спадабалася. «Работа ці адпачынак?»— усміхаецца нехта. Адпачынак. Ён сапраўды такі прыемны — пасля добрасумленна выкананай працы...

— Калі наш калектыў пачаў складвацца? Дакладна сказаць нельга. Але не адразу. Не. У канцы першага курса, памятаю, была нават нейкая адчужанасць.

Адчужанасць? Холад у адносінах? Як гэта не падобна на іх сёння! Што ж здарылася далей? А далей — на трэцім курсе — было размеркаванне па групах. На «мікробаў», як ласкава клічуць дзяўчаты мікрабіёлагаў, і «генетыкаў», гэта значыць іх саміх. Гэта было не механічнае раздзяленне групы напалам — на кафедры ішлі па прынцыпу: «куды мой сябар, туды і я». (Так што ў пачатку я была трошкі недакладнай — не аб групе я пішу, аб палове групы. Аб частцы, якая з'яўляецца самастойнай «баявой адзінкай», з уласнай камсамольскай арганізацыяй, з уласным «імем», «характарам»). І што, раздзяліліся на два лагеры? Не. Зараз генетыкі з мікрабіёлагамі чамусьці «кантачаць» значна больш, чым раней. Цяпер і шмат мерапрыемстваў сумесна праводзяць, і наогул жывуць дружней, чым тады, калі ўсе яны былі адной групай. Што гэта, парадокс ці заканамернасць? Можа сацыёлагі дапамогуць адказаць?

Але вернемся да нашых «генетыкаў». (Я ўсё ж буду называць іх групай, бо не ведаю слова дакладней). Не трэба спрашчаць — размеркаванне па кафедрах толькі дапамагло ім стварыць калектыў, але не зрабіла гэта за іх. Трэба было многае пачынаць спачатку, бо група ў 14 і група ў 25 чалавек — гэта зусім розныя калектывы, і жывуць яны кожны па сваіх законах.

— І што, быў такі дзень, калі вы раптам адчулі сябе «адзінай сям'ёй?»

— Мы проста не задумваліся над гэтым. Неяк непрыкметна для нас саміх склалася група. Але гэтай восенню, на «бульбе» мы жылі разам з першакурснікамі. І вось там зразумелі: самая вялікая розніца паміж намі і імі ў тым, што мы — калектыў...

Але час з «бульбяной пары» вярнуцца да будняў. Да вучобы. Спачатку крыху матэматыкі: з 14 чалавек 4 здалі вясновую сесію на выдатна, амаль усе астатнія — з адной чацвёркай.

— Як вам гэта ўдаецца?

— Вучымся, як усе, ніякіх «хітрыкаў» няма.

— А адзін аднаму дапамагаеце?

Нават адразу слова не знайшлі, каб адказаць.

— Дзіцячае пытанне...

— А ў СНТ займаецеся?

— Ну а як жа!

Так, думаю, змястоўная размова... Раптам Іра спынілася на паўслове, асцярожна зняла пальцам са стала нейкую парушынку і паказала Галі:

— Ты лабач, наша белавокая! Гэта нашы паддоследныя, — засмяяліся дзяўчаты, бачачы мой запытальны позірк. «Парушынка» — малюпасенькая дразафіла з прыгожымі белымі вачыма.

— Мы на іх правяраем законы Мендэля.

— І як?

— Ён усё ж меў рацыю...

Потым я здагадалася, чаму яны так неахвотна гавораць аб вучобе. Вучыцца нецікава? Яны б, напэўна, рассмяяліся ад такога пытання. Не, справа не ў тым. Проста не хочуць яны аб сваёй любімай навуцы размаўляць на такім вось узроўні: вучыцца цяжка, але цікава...

— Дзяўчаты, а ваша група часта збіраецца разам?

— Нельга сказаць, каб вельмі часта, асабліва зараз, на чацвёртым курсе, але адзін без аднаго мы ўжо не можам.

— А часу хапае?

Яны трошкі памаўчалі.

— Ведаеце,— сказала нарэшце Галя,— калі б мы былі не такія занятыя, мы б, напэўна, не адчулі каштоўнасці адпачынку...

Я расказала ім аб групе з ФПМ (гл. «Беларускі універсітэт» № 35 за 1979 г.), у якой усе вучацца добра, але вось на астатняе часу зусім не хапае. Напэўна, не ўпершыню слухалі яны такія словы, бо адразу нахмурыліся:

— Гэта ўсё адгаворкі, самападман.

Калі б яны сапраўды хацелі сустракацца часцей— знайшлі б час. Не ўсе згодны? Вядома, двух аднолькавых калектываў не бывае. І ўсё ж прыклад «генетыкаў» з IV групы пераконвае: калі чагосьці вельмі хочаш — усё здолееш.

Размова зацягнулася. Патрэбна было «закругляцца».

— Дзяўчаты, ваш калектыў складваўся цяжка. Што б вы цяпер, з вышыні свайго жыццёвага вопыту, параілі першакурснікам? З чаго ім трэба пачынаць?

— Няхай чакаюць! Толькі не рэцэптаў — як жыць, як стаць калектывам. Няхай спрабуюць самі рабіць нешта і не губляюцца, калі штосьці не будзе атрымлівацца. А так абавязкова і будзе спачатку. Трэба самім рабіць свае памылкі, самім іх выпраўляць — іншых шляхоў мы не ведаем.

Вось напісала — і бачу, што нічога я аб гэтай групе не сказала. Можна было б расказаць пра іх «Аберацыю» — насценгазету, пра гумарыстычны «Збор твораў IV групы», на вокладцы якога эпіграф: «А калі не смяяцца, то як жа выжыць?», пра многае іншае.

Яны — генетыкі— больш за ўсё цэняць у таварышах пачуццё гумару і надзейнасць. Яны «грызуць» сваю генетыку, часам сварацца і пішуць у навагодніх паштоўках: «Жадаю табе трапіць на міжнародны генетычны кангрэс»... Ды ці мала што яшчэ можна пра іх напісаць.

Але хопіць злоўжываць увагай чытачоў. Толькі вось растлумачу, чаму прозвішчаў Томы, Іры, Галі і Наташы я не называю. Так яны самі пажадалі: «Мы гаварылі ад імя ўсёй групы. Думаем, з намі б усе згадзіліся...»

Стойце, я ж самае галоўнае забылася! Аб IV групе я захацела пісаць таму, што ў мінулым годзе яна заняла другое месца ва універсітэцкім сацыялістычным спаборніцтве.

— За што вам яго прысудзілі?

Смяюцца.

— За вучобу, за грамадскую работу...

Так. За вучобу. За грамадскую работу. Ці толькі за гэта?

**В. ЕФІМЕНКА,**
**студэнтка журфака.**

# Ружовы ранак

Літаратурная старонка

**А. ЦВЯХ**

## РОДНАЙ СТАРОНЦЫ

Люблю цябе, мой ціхі родны край!
Люблю твае палі, лясы і сенажаці,
Калі пяшчотнай зеленню ўпрыгожыць цябе май,
Калі буслоў угледжу на сялянскай хаце...

Калі блакітнай бездані нябёс
На поле жытняе цяпло ласкава льецца,
Калі, сыры ад вераснёвых рос,
Туман на поплаў шэрым абрусом кладзецца...

Старонка мілая! Хоць шмат гадоў прайшло,
Хвалюеш ты мяне заўжды сваёй красою,
З маленства гэта усё ў душу маю ўвайшло,
Заўсёды ў думках разам я з табою.



**Т. БАРОДЗІЧ**

У нас з табою першая— апошняя вясна.
Таму не складныя такія пры спатканні нашы словы.

А ўсё было б намнога адмысловей,
Каб тэму «заўтра» мы не закранулі.

Цяпер між намі нейкі абавязак,
Якому сэрцамі не прысягнулі.

* * *

Людзі кажуць:
— У небе каб птушка спявала,
Трэба, каб неба чыстым было.
Каб калоссямі ніва гайдала,
Трэба сэрцаў людское цяпло.
Людзі кажуць:
— Каб слёзы табе не ўціралі,
Слёз дарэмных другім не ўчыняй.
Каб табе адчыняліся дзверы,
Іншым душу сваю адчыняй.
Людзі кажуць:
— Каб заўсёды цябе шанавалі,
Маладосці сваёй не шкадуй,
І каб дзеці людзьмі твае сталі,
Іх з любоўю к Радзіме гадуй.




ВАСЬКА хітра прыжмурыў вока, глянуў на Кольку:

— Хочаш, нешта скажу, толькі ні гу-гу, нікому, ага? Пайшлі! Колька сядзеў на старой аблезлай калодзе, якая ўжо гадоў дзесяць ляжала каля яго хаты. Бацька казаў, што калоду ён прывёз якраз у той дзень, як яму, Кольку, завязвалі ў бальніцы пупок. Хацеў зрабіць вулле, выдзеўбаў амаль усю сярэдзіну, але на дуб зацягнуць не паспеў, і зараз яна гніла тут пустой бочкай, куды хлапчукі неаднойчы хаваліся, калі гулялі ў хованку. Колька глядзеў на паблеклы блакіт неба, белыя, шкуматаныя воблакі, пугі павуцін, якія павольна, не спяшаючыся, плылі ў вышыні.

— Куды? Я ж дадому не паспеў зайсці, ды і бульбу патрэбна маці дапамагчы капаць.

— Ды тут недалёка, каля Смаловага карча. Ведаеш, я раней хацеў табе сказаць, але стрымаўся, а потым падумаў, што гэта не па-сяброўску, — Васька азірнуўся, паглядзеў па баках.

— Яна ўжо з самага лета там. Я толькі назіраў за ёю, не чапаў, а зараз вось... Засталася, ды не адна... — Васька зрабіў паўзу, але Колька не перабіваў, ведаў Васькін характар — можа зусім нічога не расказаць. — Дык не адна, кажу, з вывадкам. Усе паляцелі, а яны ў балоце, каля Смаловага карча... Кожны вечар і раніцу плаваюць.

Смаловым карчом называлі невялікае азярцо, аплеценае з усіх бакоў лазняком, чаротам. Раней, кажуць, тут быў цэлы сасновы лес. Грозны, непрыступны, мажна шапацеў лапамі наўкол возера. Бацька і калоду прывёз адтуль, а потым... Потым ад лесу застаўся той адзіны корч, смаловы, каржакаваты, які па самую вершаліну, быццам уцякаючы ад некага, забраўся ў ваду і хлюпаў іголкамі раз-пораз па празрыстаму люстэрку возера, капаў бурштынавымі слёзамі. Доўга-доўга. Кажуць, што ад гэтага, а можа і не, дакладна ніхто не ведае, вада ў возеры была нейкая жаўтаватая. У сонечны дзень здавалася, быццам у глыбокую чашу возера налілі пахучага ліпавага мёду.

...Спачатку пачуўся лёгкі ўсплеск, потым з-за густога чароту паказалася купка шэрых кропачак.

— Зараз яны сюды прыплывуць. Заўсёды так... Спачатку абгледзяць усё, а потым і на сярэдзіну, — Васька гаварыў шэптам, але неўзабаве згарнуў у трубачку далоні і тры разы гучна, па-качынаму кракнуў. Колька ў здзіўленні глянуў на Ваську: «Ну-у і Васька, вось табе і ціхоня». Качкі бойка адазваліся і, пакруціўшы галавой, накіраваліся ў іх бок.

— Ты схавайся, яны да мяне прывыклі ўжо. Толькі недалёка, у чарот адыдзі крыху... потым і да цябе прывыкнуць.

Колька недаўменна апусціў рукі, потым павярнуўся і пакрыўджана зашамацеў чаротам: «Ну і хай ідзе са сваімі качкамі. Спачатку паклікаў, а потым — хавайся. Сам хавайся». Але далёка не пайшоў, прысеў і пачаў назіраць. Качка з вывадкам неўзабаве падплыла і метры за два ад Ваські застыла на месцы.

— Ну, што, не пазналі, — Васька адкрыў партфель, выняў з яго белы батон, пачаў крышыць і кідаць качанятам. Цягнулася гэтая «цырымонія», як адзначыў Колька, амаль паўгадзіны. Васька ўжо стаяў у сярэдзіне качынага сямейства і шчодра раздаваў пачастункі, а ў яго, Колькі, ужо пачало зводзіць ногі, колам стала спіна, але ён не ўставаў, чакаў, не можа быць, каб Васька забыўся пра яго.

— Колька, выходзь, толькі ціха, на табе батона крыху, — Васька кінуў яму праз плячо кусок булкі. «Нарэшце», — Колька разагнуў самлелую спіну і надзьмутай шапкай, бы баравіком, загойдаўся ў чароце...

Яны прыходзілі амаль кожны дзень. Вывадак хутка прывык да Колькі. Васька нават здзівіўся такому павароту справы. Нават неяк крыўдна. Але Васька не мог крыўдзіцца, ды і па-другому не магло быць. Вывадак паверыў Ваську, а Васька з дрэнным сябрам прыйсці не мог.

Хлапчукі з надзеяй і хваляваннем сачылі за вывадкам. Шэрая не змагла падняць сваю сям'ю і павесці на поўдзень, таму што качаняты былі «познія» і лятали пакуль што слаба. Але з кожным днём яны набіраліся моцы, і кожны дзень Ваську і Кольку разам з хваляваннем прыносіў і радасць. Качка хутка паляціць! Верасень падыходзіў к канцу, і неба пачало зацягваць шэрымі аблезлымі хмарамі, ад чаго небасхіл, здавалася, усё бліжэй і бліжэй падступаў да возера. На возера амаль ніхто не заходзіў, хоць рыбы было ў ім шмат. Але, заросшае і закінутае, яно нечым палохала ўсіх, і таму наведвальнікаў сустрэць тут можна было не так часта. Праўда, той-сёй заходзіў іншы раз, але, пабарахтаўшыся ў карчах, вяртаўся ні з чым. Толькі ў апошні час пачаў насцярожваць Базыль — высокі хударлявы хлапец. Ён быў старэйшы за іх год на дзесяць, у арміі не служыў, застаўся пры бацьках, але ў калгас на работу не хадзіў: лавіў рыбу, паляваў, збіраў грыбы. Вазіў прадаваць па суседніх вёсках і неўзабаве купіў сабе новенькі матацыкл «Мінскі». Усе хлапчукі зайздросцілі, ды і яны, Васька і Колька, што там казаць, зайздросцілі яму, але адначасова і баяліся. Ён быў нейкі злосны і сквапны да ўсяго, калі што — літасці ў яго не прасі. Вось ужо два дні запар ён зачасціў на возера. Доўга расчышчаў, выцягваў на бераг затопленыя карчы, падсыпаў у ваду падкормку і на трэці дзень выплыў на возера на гумавай камеры з камбайнавага кола.

— Сеткі ставіць будзе, ражоўкі, — Васька моцна сціснуў Кольку за руку. — Во зладзюга, і сюды дабраўся.

У той дзень качка не выплыла, ды і Васька не трубіў у далоні, не хацеў выклікаць.

— Пайшлі, Вась, заўтра раніцою прыйдзем, у гадзін шэсць, да заняткаў паспеем. Я маці скажу, яна якраз карову доіць, дык разбудзіць...

На золку яны ўжо беглі па мокрай траве да возера. Гумавыя боты, на некалькі памераў большыя, балюча рэзалі ногі. Колька спаткнуўся і з усяго размаху шмякнуўся між купін. Васька праляцеў міма, але раптам таксама бухнуў пад купіну. Там, за белай коўдрай туману, які павіс на лазовых карчах, заблытаўся ў цыбатым чароце, заматыляла чыясьці постаць. Пакуль Колька валтузіўся за купінай з ботамі, постаць усё бліжэй і бліжэй набліжалася да іх.

— Знаёмая шапка, паходка, завернутыя халявы рыбацкіх ботаў — усё нагадвала... Так і ёсць, Базыль. Чаго ён у такую рань, мо сеткі здымаў, каб ніхто не бачыў днём. Ды цішэй ты, — Васька шыкнуў на Кольку, які таксама ўжо ўгледзеў Базыля і масціўся каля Ваські.

...А Базыль ужо выйшаў з-за карчоў і буслінай паходкай дыбаў па лузе. За спіной, цяжка згінаючыся, ён нёс мяшок, у якім увесь час нешта падрыгвала, трапятала, а ў руках... Васька ажно не паверыў вачам. У правай руцэ ён нязграбна трымаў іх шэрую качку. Яна была яшчэ жывая, бо ўвесь час лапатала крыламі, гучна біла па галянішчах гумавых ботаў.

— Вась, дык гэта ж наша Шэрая, — Колька штурхнуў Ваську, але той маўчаў. Потым ва ўвесь рост паявіўся амаль перад самым Базылём, ад чаго той астанавіўся, як укапаны, хвіліну маўчаў, потым, нібы апрытомнеўшы, прасіпеў:

— А-а, хлопцы, — аблізаў асмяглыя губы. — Куды ў такую рань? А я вось з рыбалкі, можна сказаць. Такога ўлову, хлопцы, яшчэ ніхто не бачыў. Во-о, — ён патрос у паветры качкай, — рукамі злавіў, уручную, так сказаць, такое багацце прыдбаў. Ну, колькі дасце? Дык гэта не ўсё, — Базыль ажывіўся, зняў з плячэй мяшок. — Тут у мяне яшчэ шмат, гэтыя прама ў сетку. Ну а я што, мне толькі давай ды паболей...—Базыль вышчарыў жоўтыя зубы, сцёр з рабаціністага твару кроплі поту. — Цяжка, трасца б ім, восем штук ажно...

І тут Васька кінуўся на Базыля з кулакамі. Базыль адступіў назад, але качку з рук не выпускаў, пранізваў вачыма Ваську. Васька маўчаў, моцна сцяўшы зубы. З вачэй адна за адной капалі слёзы. Прама на траву, росную і мокрую. Слёзы такія, як і раса, чыстыя, але толькі салёныя.


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

17 СТУДЗЕНЯ 1980 г.

Заказ 109. АТ 15017

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара В. П. ВАРАБ'ЁЎ